прапанаваны навуковаму аддзелу інфармацыі па культуры і мастацтву Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі для публікацыі.

Усё сказанае ў сукупнасці дапаможа развіццю пазнавальных здольнасцей студэнтаў і падрыхтоўцы іх да шматграннай навукова-даследчай і інфармацыйнай дзейнасці.

**Ільіна Н.Р.,**
ст. выкладчык

## СПЕЦКУРС «ПАЭЗІЯ І МУЗЫКА» ЯК ФОРМА РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Пытанне аб развіцці здольнасцей цесна звязана з агульнай праблемай развіцця асобы чалавека. У адпаведнасці з думкамі навукоўцаў, здольнасці -- гэта такія псіхалагічныя асаблівасці чалавека, ад якіх залежыць набыццё ведаў, звычак, уменняў, але якія самі да гэтых ведаў, звычак не зводзяцца.

Разгляд суадносін задаткаў і здольнасцей паказвае: нягледзячы на тое, што развіццё апошніх залежыць ад прыродных перадумоў, якія далёка не аднолькавыя ў розных людзей, здольнасці не толькі дар прыроды, але і прадукт чалавечай гісторыі. Значыць, праяўленне здольнасцей знаходзіцца ў прамой залежнасці ад канкрэтных прыёмаў фарміравання ведаў і ўменняў.

Калі гаварыць аб структуры творчых здольнасцей, можна вылучыць такія якасці, як пільнасць, сабранасць, гатоўнасць да напружанай працы. Акрамя таго, творчай асобе ўласцівы хуткасць мысліцельнага працэсу, вялікія магчымасці аналізу і абагульнення. Усе гэтыя якасці мы можам разгортваць і ўдасканальваць. У дасягненні гэтай мэты нам дапамагаюць розныя формы работы і методыкі.

Так, напрыклад, спецкурс «Паэзія і музыка», які быў уключаны ў праграму падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «харавое дырыжыраванне», выявіў, што на занятках можна рашаць праблемы, звязаныя з развіццём творчых здольнасцей студэнтаў.

Лекцыйны курс, уключаючы цікавую інфармацыю аб творчасці такіх паэтаў, як С.Ясенін, А.Блок, В.Мандэльштам, М.Цвятаева і інш., аб іх адносінах са светам музыкі, абуджае творчую думку і ўяўленне студэнтаў, прымушае лепш зразумець прыроду творчасці. У сваю чаргу, вобразы, створаныя паэтамі, прымушаюць працаваць фантазію студэнтаў. А фантазія, як мы ведаем, выступае неабходным элементам творчай дзейнасці ў мастацтве і літаратуры. Праз лекцыйны і практычны матэрыял мы дамагаемся таго, каб уключыць у работу ўяўленне студэнтаў. Вядома, што вельмі важная асаблівасць уяўлення, якое ўдзельнічае ў творчай дзейнасці будучага мастака, спевака, -- яго эмацыянальнасць. Вобраз, сітуацыя, нечаканы паварот сюжэта, якому мы вучым суперажываць студэнта, прапускаючы праз свайго роду прыстасаванне, якім служыць эмацыянальная сфера творчай асобы.

Семінарскія заняткі праводзіліся такім чынам, што далі магчымасць студэнтам лепш раскрыць свае здольнасці. Напрыклад, выконваліся музычныя і паэтычныя творы, якія стварылі самі студэнты. Пасля праслухоўвання праходзілі абмеркаванне і аналіз твораў. Для спецкурса быў запісаны фанаграфічны матэрыял, які дазволіў адчуць непазрыўнае адзінства музычнага гуку і паэтычнага слова.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што спецкурсы дапамагаюць у вырашэнні задачы развіцця творчых здольнасцей студэнтаў. Па-першае, яны прызначаны для студэнтаў, якія ўсвядомілі свае інтарэсы ў плане будучай прафесійнай дзейнасці; па-другое, дакладна акрэслены круг тэм і дробнагрупавыя заняткі дазваляюць дасягаць больш значных поспехаў. І, па-трэцяе, мы ў нейкай меры даем магчымасць студэнтам рэалізаваць свае мары, таму што мара -- гэта неабходная ўмова рэалізацыі творчых магчымасцей чалавека. У сувязі з гэтым хочацца ўспомніць словы Д.І.Пісарава, які гаварыў аб мары, як аб штуршку да працы: «Калі б чалавек зусім не меў здольнасці марыць, тады б я ніяк не мог уявіць, якая пабуджальная прычына прымусіла б чалавека

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадпрымаць і даводзіць да канца вялікія і ўтомныя работы ў галіне мастацтва, навукі і практычнага жыцця».

**Садаўнічы Э.В.,**
дацэнт

## РАЗВІЦЦЁ САМАСТОЙНАСЦІ МЫСЛЕННЯ Ў СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Літаратура дае велізарныя магчымасці для развіцця ў студэнтаў самастойнага, творчага асэнсавання як асобных твораў, так і самога літаратурнага працэсу, а праз літаратуру і наогул рэчаіснаці: нездарма ж было сказана, што «кніга -- падручнік жыцця».

На некаторых прыкладах, узятых з нашай практыкі правядзення лекцыйных і семінарскіх заняткаў у бягучым навучальным годзе, паспрабуем паказаць, з дапамогай якіх дыдактычных прыёмаў мы імкнёмся дасягнуць мэты развіцця самастойнасці мыслення ў студэнтаў.

Разглядаецца на лекцыі, скажам, тэма «Асветніцкая літаратура». Дадзена характарыстыка асветніцкага руху, адзначаны асноўныя мастацкія варункі яго літаратуры, сказана пра асаблівасці Асветніцтва ў Англіі, амаль прааналізаваны раман Дэфо «Рабінзон Круза», змест якога студэнты з большага ведаюць яшчэ з дзяцінства. Напрыканцы гаворкі пра раман звяртаем ўвагу студэнтаў на моманты ў творы, якія не супадаюць з вышэй- - сказаным, і, такім чынам уцягваем іх у актыўны роздум, ставячы перад неабходнасцю самастойных пошукаў рашэння: «На якой падставе адносіцца раман да асветніцкай літаратуры з яе адзінай агульнай антыфеадальнай накіраванасцю, калі герой яго жыве на бязлюдным востраве наогул па-за ўсялякім грамадствам, хоць ён і «новы герой», прадстаўнік трэцяга саслоўя?»

У рэшце рэшт робіцца вывад, што сцвярджэнне працы як асновы жыцця чалавека і ўзвышэння яго як асобы, так ярка ўпершыню ў сусветнай літаратуры выказанае ў рамане Дэфо, супрацьпастаўляецца стаўленню дваранскага класа да працы, у першую чаргу да фізічнай. Пры гэтым для студэнтаў становіцца відавочным, што кожны мастацкі твор, каб глыбей зразумець яго сэнс, заўсёды неабходна разглядаць у кантэксце часу, у які ён створаны, незалежна ад таго, пра што ён: пра мінулае ці далёкую будучыню.

Альбо яшчэ прыклад. Тэма семінарскіх заняткаў «Фауст» Гётэ. Падчас аналізу твора студэнтамі звяртаем іх увагу на маральны аспект выкарыстанага аўтарам сюжэта пра продаж душы д'яблу. Ці добра гэтак рабіць? Амаральна. А калі ў імя духоўных пошукаў? Продаж душы дзеля той самай душы -- нонсенс. Як жа быць з Фаустам, чалавекам высокіх духоўных парываў? Паступова высвятляецца, што Фауст няверуючы, як і сам Гётэ.

У выніку нараджаюцца новыя пытанні. Што дае Гётэ выкарыстанне біблейскіх персанажаў і матываў? Навошта аўтару спатрэбіўся пралог на небе? Можна было б увесці Мефістофіля ў дзеянне твора і іншым спосабам.

Карацей, атрымліваецца так, што закранаецца праблема суадносін у мастацкім творы фантастычнага /міфалагічнага, біблейскага/ і рэалістычнага планаў. Праводзяцца паралелі паміж «Фаустам» і гамераўскім эпасам. Узгадваецца і той жа «Рабінзон Круза», дзе аўтар з дапамогай непраўдападобнага сюжэта, няпраўды раскрывае глыбокую агульначалавечую па значнасці ісціну пра чалавека. І наконт гётэўскага твора студэнты выказваюць шмат цікавых меркаванняў, вызначаючы месца біблейскіх вобразаў у сістэме мастацкіх вобразаў твора, іх «змястойную» і «фармальную» ролю і функцыянальнасць.

Падобных прыкладаў можна прывесці мноства.

Ужыванне «эўрыстычных» прыёмаў і спосабаў, прыстасаваных да літаратурнага матэрыялу, дае добры плён у актывізацыі і развіцці мыслення, разумовых здольнасцей навучэнцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ